

Спартыўны комплекс «Стайкі».

га. Трыбуны больш як на 50 тыс. месцаў. Мае 8 бегавых дарожак, сектары для скачкоў і кіданняў, пляцоўкі для валейбола, баскетбола, гульні ў гарадкі, тэнісныя корты, стралковы цір. Пад трыбунамі залы для лёгкай атлетыкі, барацьбы, боксу, лёгкаатлетычны цэнтр са спец. трэнажорамі, прэс-цэнгр. На стадыёне праводзяцца рэсп. і міжнар. спаборніцтвы.

**СТАДЫЁНЫ**. На Беларусі у 1920—30-я г. пабудавана 14 С. У Вял. Айч. вайну ўсе разбураны. У пасляваен. час адноўлены старыя, пабудаваны новыя С. На 1994 больш за 130 С. з трыбунамі ад 1,5 тыс. да 50 тыс. месцаў. Пераважная большасць С. у Мінску, абл. цэнтрах і інш. буйных гарадах.

Найб. вядомыя і буйныя: у Мінску — *стадыён «Дынама»*, «Трактар» (пабудаваны ў 1968, рэканструяваны ў 1978, умяшчае 25 тыс. гледачоў); у Брэсце — «Дынама» (1937, рэканструяваны ў 1951, 10,6 тыс.), «Лакаматыў» (1972, 3 тыс.); у Віцебску — «Дынама» (1937, рэканструяваны ў 1980—86, 5 тыс.), «Лакаматыў» (1964, 1,5 тыс.); у Гомелі — «Лакаматыў» (1926, 15 тыс.), 2 С. «Гомсельмаш» (1966, на 9,7 і 5 тыс.); у Гродне — «Чырвоны сцяг» (1963, 15 тыс.); у Магілёве — «Спартак» (1956, рэканструяваны ў 1982, 12 тыс.).

**«СТА́ЙКІ»**, спарт. комплекс, гал. база падрыхтоўкі нац. зборных Беларусі па розных відах спорту. За 15 км на ПдУ ад Мінска. Засн. ў 1947. Пл. 136 га, з іх 76 га — пад лесам.

Уключае універсальны манеж для заняткаў лёгкай атлетыкай і гульнявымі відамі спорту (72×49 м), спарт. залы для трэніровак і спаборніцтваў футбалістаў (54×36 м), гімнастаў (30×20 м), фехтавальшчыкаў (2 залы 24×12 м), гасцініцу, медыка-рэабілітацыйны цэнтр, бібліятэку, кінаканцэртны і кіналекцыйны залы, інш. дапаможныя памяшканні. На тэр. комплексу стадыён — футбольнае поле з лёгкаатлетычнымі дарожкамі і сектарамі, комплекс футбольных палёў і спарт. пляцовак для валейбола, баскетбола, гандбола, тэнісныя корты. У «С.» адначасова могуць трэніравацца больш за 800 спартсменаў па 26 відах спорту, праводзяцца рэсп. і міжнар. спаборніцтвы.

**СТАЛЫПІНСКАЯ АГРА́РНАЯ РЭФО́РМА**, сістэма ўрадавых мерапрыемстваў па змяненні характару сял. землеўладання ў Рас. імперыі на пач. 20 ст. Ініцыятар і выканаўца — П.А.Сталыпін, старшыня Савета міністраў і міністр унутр. спраў. Мела на мэце стварэнне спрыяльных умоў для развіцця капіталіст. адносін у сельскай гаспадарцы, індустрыялізацыі Расіі. Гал. сродкі — разбурэнне сял. абшчыны, стварэнне хугароў, перасяленне беззямельных сялян з Еўрап. ч. Расіі ў Сібір, замацаванне зямлі ў асабістай сял. уласнасці.

Паводле ўказа ад 22.11.1906 кожны гаспадар, калі пажадае, мог выйсці з абшчыны і замацаваць у асабістую ўласнасць сваю надзельную зямлю. Палажэнне ад 12.6.1911 устанаўлівала прымусовы выхад з абшчыны і замацаванне зямлі ў прыватную ўласнасць. Сял. пазямельны банк прадаваў зямлю ў крэдыт. У 5 бел. губернях у 1907—15 прададзена 228 705 дзесяцін зямлі пад адрубы і хутары. За гэты час з Беларусі выехала 335 366 чал. (10,9% з іх вярнуліся на радзіму). Да 1905 абшчыннае землеўладанне існавала толькі ў Віцебскай (53% сял. двароў) і Магілёўскай (81,2% сял. двароў) губ. Да 1916 у гэтых губернях з абшчын выйшла 63% двароў. Усяго на Беларусі створана больш за 128 тыс. хутароў і адрубаў, куды перайшло 12% усіх сял. двароў. Рэалізацыя рэформы прыпынена з пач. 1-й сусв. вайны, адменена 10.7.1917 пастановай Часовага ўрада.

На Беларусі, у адрозненне ад Расіі, рэформа мела станоўчы характар; за 1901—13 на 37,6% пабольшаў збор бульбы, павялічыліся пл. пасеву лёну, збожжавых культур. *М.М.Забаўскі.*

**СТАЛЬМА́ШНАЕ РАМЯСТВО́**, выраб транспартных гужавых сродкаў. Аб'ядноўвае шэраг функцыянальна блізкіх промыслаў: выраб колаў і колавых транспартных сродкаў, палазоў і палазных транспартных сродкаў. Выраб колавых (летніх) транспартных сродкаў больш складаны, чым палазных (зімовых). На Беларусі карпусы рабочых вазоў звычайна рабілі самі сяляне, аднак колы для іх куплялі ў майстроў-стальмахоў (калёснікаў). У вытв-сці колаў існавала спецыялізацыя па асобных аперацыях. Гнуццё абадоў кааперавалася з гнуццём санных палазоў і дуг, выраб калодак для колаў — з *такарным рамяством*, акоўка колаў — з кавальствам. Абады выраблялі з дубу, вязу, клёну; калодкі — з бярозы-чачоткі, радзей з дубу ці вольхі; спіцы — з дубу ці ясеню. Найб. пашыраныя былі абадныя колы (вядомыя са старажытнасці), больш архаічныя — неабадныя суцэльнакругавыя і т. зв. звенчаковыя. Да пач. 20 ст. вазы рабілі амаль цалкам з дрэва. Вазы на драўляных восях бытавалі да сярэдзіны 20 ст. З апошняй трэці 20 ст. ў рабочых вазах усё часцей выкарыстоўваюць гумавыя колы. Выцясненне гужавых трансп. сродкаў аўтамабілем прывяло да скарачэння С.р. У наш час стальмахі вырабляюць карпусы рабочых павозак і саней для кааператыўных і ўласных гаспадарак.

**СТАЛЬМАШО́НАК** Уладзімір Іванавіч (н. 6.2.1928, Мінск), жывапісец, педагог. Нар. мастак Беларусі (1988). Скончыў Ін-т жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя Рэпіна ў С.-Пецярбургу (1957). Выкладае ў Бел. акадэміі мастацтваў. Працуе ў станковым жывапісе, манум.-дэкар. мастацтве. Жывапісным творам уласцівы выразнасць, гарманічнасць, манументалізацыя вобразаў. Значнае месца ў творчасці займаюць вобразы дзеячаў Беларусі: партрэты Я.Коласа, Р.Шырмы, К.П.Арлоўскага, С.В.Прытыцкага, «Дзед Талаш», серыя гіст. асоб «Славутасці Беларусі» (М.Багдановіч, Я.Купала, Ефрасіння Полацкая, Ф.Скарына і інш.). Выканаў вітражы ў Літ. музеі Я.Купалы, Доме літаратара, «Мінск і мінчане» для комплексу грамадскага харчавання ў Патсдаме (Германія), размалёўку ў Палацы куль-



У.Стальмашонак. Партрэт Р.Шырмы. 1968.



Да арт. Сталярства. Канапа. Вёска Мядзвецк Чашніцкага раёна. 1938—40-я г.